Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 196
(26309)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Грошы

## 147 ЗЛІТКАЎ — АМАЛЬ ПА $30 000 КОЖНЫ...

**Сёлета за 9 месяцаў насельніцтвам куплена ў банках ужо больш за паўтары тоны залатых мерных зліткаў — 1531,1 кілаграма (51 174 штукі), паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч.**

А вось летась за адпаведны перыяд продаж грамадзянам зліткаў не дацягваў нават і да паўтоны: тады за студзень—верасень людзі набылі каля 487 кілаграмаў каштоўнага металу ў злітках. Гэта значыць, за згаданы намі перыяд попыт на высакародны метал узрос больш як у тры разы — у 3,1 раза. Між іншым, толькі за верасень гэтага года ў банках было куплена амаль 100 кілаграмаў мерных зліткаў з золата. Як і раней, у прыярытэтах пакупнікоў нічога не змянілася: асаблівай папулярнасцю карыстаюцца менавіта 10-грамовыя злiткі, якіх было рэалізавана за 9 месяцаў 13 970 штук, ці 27,3 працэнта ад агульнай колькасці. Знайшлося нямала ахвотнікаў прыкупіць і больш важкія зліткі, кошт якіх — не кожнаму па кішэні. Так, напрыклад, кілаграмовых зліткаў, кошт якіх складае зараз 29 тысяч 978 доларaў ЗША, прададзена 147, а паўкілаграмовых (па 14 тысяч 619 доларaў) і наогул рэалізавана аж 461 штука. Між іншым, з пачатку рэалізацыі ў рэспубліцы залатых мерных зліткаў (са жніўня 2001 года) насельніцтвам набыта зліткаў агульнай вагой больш за чатыры з паловай тоны.

На фоне залатых зліткаў рэалізацыя плацінавых за 9 месяцаў — вельмі сціплая лічба. У грамадзян набыць гэты метал хапіла «ахвоты» толькі на 941 плацінавы злітак агульнай вагой 8,6 кілаграма. Што ж датычыцца серабра, то гэтых зліткаў сёлета куплена пакуль толькі 212 штук, агульны аб'ём іх рэалізацыі пацягнуў на 72,4 кілаграма.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

Гульня № 1

## Беларускія футбалісты — у фінале маладзёжнага чэмпіянату Еўропы

Пасля гасцявога паражэння ад туркаў з лікам 0:1 падапечныя Юрыя Курненіна ўзялі рэванш і атрымалі запаветную пуцёўку ў фінальную стадыю кантынентальнага першынства, якое пройдзе ў чэрвені 2009 года на футбольных палях Швецыі, дзякуючы перамозе з лікам 2:0 (Міхаіл Сівакоў і Ігар Шытаў).

## «МЫ ВЕЛЬМІ ПАСТАРАЕМСЯ»

**Англічане завалодалі беларускай сталіцай. У дзень матча ў цэнтры горада яны паўсюль — дзве з паловай тысячы балельшчыкаў з туманнага Альбіёна чартарамі працягваюць прыбываць у Мінск. Здаецца, нават людзі, далёкія ад футбола, павінны заўважыць, што вялікія падзеі адбываюцца ў беларускай сталіцы. Дэвід Бэкхэм, Уэйн Руні, Рыа Фердынанд — мара балельшчыкаў і балельшчыц усяго свету — зараз у Мінску. Зараз вынік матча мы ўжо ведаем. А якія прагнозы наконт «сустрэчы стагоддзя» даваліся напярэдадні?**

***Ягор ФІЛІПЕНКА, абаронца нацыянальнай зборнай і ФК «Спартак», Масква:***

— У мяне заўсёды была мара гуляць у нацыянальнай зборнай Беларусі і я яе ўвасобіў. І цяпер супраць каго гуляць — Андоры ці Англіі — не важна. Падрыхтоўка да Англіі прайшла нармальна, правялі ў Германіі тыднёвы збор. Падышлі да гульні ў поўным узбраенні. Мы будзем вельмі старацца набраць тры ачкі ў гэтай гульні...

***Андрэй АСМАЛОЎСКІ, аглядальнік газеты «Комсомольская правда»:***

— Спадзяюся на вынік 0:0. Мяркую, што зборная Беларусі зробіць усё магчымае, каб не прапусціць. Што-што, а адбівацца ад грандаў мы ўмеем. Аб гэтым сведчаць паядынкі са зборнымі Германіі, Аргенціны. І калі Англія не здолее нам забіць, гэта будзе вялікі поспех беларускай каманды. А ўлічваючы, што цяпер нападзення ў нас практычна няма, то разлічваць на галы не прыходзіцца...

***Віталь МАРЭЦКІ, менеджар сталічнага камерцыйнага прадпрыемства:***

— Думаю, што будзе 1:1. Прычым пра шанцы на нічыю ў гэтым матчы мне гаварылі многія мае знаёмыя. У нашай каманды змянілася псіхалогія, магу гэта сказаць, як балельшчык з вялікім стажам. Мне 30 гадоў, а мой балельшчыцкі стаж 30 гадоў і 9 месяцаў — яшчэ мая мама разам з татам хадзіла на стадыён. У нашых футбалістаў змяніўся менталітэт, яны не баяцца саперніка, хто б там ні выходзіў на поле — немцы, англічане, аргенцінцы. Калі англічане і могуць перамагчы, то толькі за кошт індывідуальнага майстэрства. На мой погляд, падтрымка балельшчыкаў будзе яшчэ лепшай, чым на матчы БАТЭ—«Ювентус», хоць і там яна была неверагоднай. Сёння ахвяраваў абедам і паехаў у цэнтр горада паглядзець на англійскіх балельшчыкаў. Трэба бачыць, што тут робіцца. На праспекце ад Нацыянальнага банка да «Макдональдса» іх столькі! Адна англійская гутарка паўсюль. Валюту мяняюць, сядзяць у кафэ, рэстаранах, побач з кафэ сцягі свае паразвешвалі. На плошчы Перамогі яны ўсклалі вянок у форме сцяга Англіі, вельмі прыгожы, дарэчы, нават беларускія балельшчыкі побач з ім фатаграфуюцца. Нават шатландцаў тры гады таму столькі не было, праўда тыя былі ў кілтах, адразу ў вочы кідаліся. Англічане, дарэчы, апрануты ў шорты і майкі. Пытаю, чаму так лёгка апрануліся, адказваюць, што думалі, што ў нас куды цяплей. Растлумачыў ім, што падчас матча, стане зусім холадна.

***Таццяна МАСКВІНА, дзесяціразовая чэмпіёнка свету па самба:***

— Мае прагнозы на матч? А якія каманды гуляюць? Я думаю, наша зборная прайграе. Дзесьці 1:3, каб ужо зусім нашых не крыўдзіць. Чаму не веру ў нашу каманду? Скажу так, што не веру ні на адзін працэнт, а чаму — асобнае пытанне і разважаць над ім зараз не хацелася б.

***Уладзімір ДЗЕШКАВЕЦ, супрацоўнік Міністэрства транспарту:***

— Вось ужо каторы раз не ўдаецца трапіць на сталічны стадыён «Дынама». Трэба штосьці мяняць у сістэме размеркавання білетаў і, на мой погляд, большасць іх павінна прадавацца праз касы...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**



*Рыа ФЕРДЫНАНД, Дэвід БЭКХЭМ і Уэйн РУНІ (у цэнтры) на мінскім стадыёне «Дынама».*




**Вы хочаце карпа ці амура? Альбо шчупака? Сома на пару кіло ці экзатычную сцерлядзь? Тады вам варта наведаць шматлікія сажалкі доследнага рыбгаса «Белае» Жыткавіцкага раёна. Сёлета тут багаты ўраджай прамысловай рыбы і нават самы пераборлівы гурман задаволіць свой густ. А патомны рыбавод Барыс СУЛКОЎСКІ *(на фотаздымку)* дапаможа выбраць тавар і на вашых вачах зловіць любога віду, памеру і вагі. Амаль трыццаць гадоў адпрацаваў ён на гадаванні і адлове сажалкавай рыбы, хоць прафесія рыбака з нялёгкіх. Цяпер загадвае рыбнай базай вядомага палескага прадпрыемства. Штодня з гэтага ўчастка дзясяткі аўтамашын развозяць па Гомельшчыне жывую палескую рыбу.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Саўмін Беларусі вызначыў кола работнікаў, якія падлягаюць абавязковаму прафесійнаму пенсійнаму страхаванню

**Урад Беларусі вызначыў кола работнікаў, якія падлягаюць з 1 студзеня 2009 года абавязковаму прафесійнаму пенсійнаму страхаванню.**

За аснову тут былі ўзяты катэгорыі работнікаў, якія карыстаюцца правам на датэрміновыя пенсіі сёння. Спісы № 1 і № 2 будуць прымяняцца ў дзеючай рэдакцыі, без кардынальнага перагляду. Для мэтаў прафесійнага пенсійнага страхавання ў абавязковым парадку будзе ацэнены стан умоў працы на кожным рабочым месцы. Для гэтага прымяняюцца вынікі атэстацыі.

Адначасова Урад зацвердзіў Палажэнне аб парадку вылічэння спецыяльнага стажу для вызначэння права на датэрміновую прафесійную пенсію.

У сістэме прафесійных пенсій фарміраванне (накапленне) пенсійных правоў будзе ажыццяўляцца ў перыяд «шкоднай» работы адначасова з улікам узносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне.

**БЕЛТА.**

### ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю работу 27 кастрычніка 2008 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 27 кастрычніка 2008 года з 8.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

Твае правы

## КВАТЭРА ПАЧЫНАЕЦЦА З... ЧАРГІ

**Ёсць грошы — няма асаблівых праблем. Наша заканадаўства не абмяжоўвае магчымасці куплі нерухомасці. Па сутнасці кватэр ці дамоў можна мець колькі заўгодна і да таго ж у любым населеным пункце. Зрэшты, таксама не сакрэт: грамадзян, якія могуць сабе дазволіць набыццё нерухомасці на ўласныя сродкі, не так і шмат. А жыллёвая праблема, нягледзячы на павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва, была і застаецца адной з найбольш вострых.**

У цэлым па краіне патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў маюць больш за 700 тыс. сем'яў, і, да прыкладу, зараз у Мінску «рухаецца» чарга 1989 года. Зрэшты, для абсалютнай большасці з нас без гэтай чаргі — усё ж аніяк. Яна дае прынамсі нам тры перавагі: дзяржпадтрымку ў будаўніцтве, вызваленне ад аплаты за інфраструктуру і вылікі па падаходным падатку. Хто адносіцца да грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, якія «асаблівыя правілы» тут вызначаны для сталіцы і калі можна «падзяліць» чаргу паміж бацькамі і дзецьмі? Разабрацца з усім гэтым і іншым мы паспрабуем з дапамогай **намесніка загадчыка юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Васіля Мікалаевіча КОРСУКА.**

***МЕТРАЖ ЛІЧАЦЬ НЕ ЗАЎСЁДЫ***

Першая і галоўная ўмова пастаноўкі ў чаргу — адсутнасць уласнага жылля або невялікі памер кватэры. На кожнага члена сям'і ў ёй павінна прыпадаць менш за 15 «квадратаў» агульнай плошчы.

Разам з тым у заканадаўстве вызначаны катэгорыі, якія прымаюцца на ўлік без спасылак на метраж. У прыватнасці, такім правам карыстаюцца грамадзяне, якія ўзялі першы шлюб і не маюць свайго жылля. Найперш тут маюцца на ўвазе маладыя сем'і, якія жывуць у кватэры бацькоў. Але не толькі. Падобнае ж права пастаноўкі ў чаргу маюць і сем'і ў большым узросце (пры ўмове, што яны зноў-такі ўзялі першы шлюб, не маюць ва ўласнасці жылля і, да прыкладу, жывуць у кватэры ўжо дарослых дзяцей), а таксама грамадзяне, якія нарадзілі або ўсынавілі і выхоўваюць дзяцей без узяцця шлюбу.

— Варта заўважыць, што літаральна з 7 кастрычніка гэтага года катэгорыя грамадзян, за якімі прызнана права на паляпшэнне жыллёвых умоў без уліку метражу, пашырылася, — кажа Васіль Корсук. — Цяпер да гэтай катэгорыі адносяцца і грамадзяне, якія выхоўваюць дзяцей пасля скасавання шлюбу, а таксама ўдовы, што не ўзялі новы шлюб.

***НАСТАЎНІК І ЎРАЧ — НЕ ВЫКЛЮЧЭННІ***

Зноў-такі з 7 кастрычніка з'явілася істотнае новаўвядзенне ў правілах прадастаўлення жылля ў вёсцы. Цяпер настаўнікі, урачы, работнікі культуры і іншых сацыяльных галін, якія абслугоўваюць працоўныя калектывы сельгасарганізацый, могуць прымацца на ўлік у гэтых сельгасарганізацыях і атрымліваць праз іх домікі ці кватэры.

— Апроч таго, з 7 кастрычніка работнікі сельскагаспадарчай сферы, якім былі прадастаўлены службовыя домікі, маюць права звярнуцца ў гаспадарку з тым, каб гаспадарка пераняла доўг па крэдыце, зняла з жылля статус службовага і перадала яго ва ўласнасць, — працягвае Васіль Корсук. — Заўважу, што тут маюцца на ўвазе работнікі ўсіх сельгасарганізацый — раней такая магчымасць была прадугледжана толькі для СВК.

***АСАБЛІВЫ СТАТУС МІНСКА***

Да 1 студзеня гэтага года стаць на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў у сталіцы можна было без абмежаванняў. Аднак з 1 студзеня правілы змяніліся. Па сутнасці вярнулася старая норма савецкіх часоў — для пастаноўкі ў чаргу неабходна наяўнасць не менш чым 5-гадовай рэгістрацыі ў найбуйнейшым горадзе Беларусі. Дзеля справядлівасці, «адтэрміноўка» дзейнічае не заўсёды. Па-першае, яна не датычыцца грамадзян, якія рэгіструюцца ў жылых памяшканнях мужа ці жонкі, няпоўнагадовых або поўнагадовых непрацаздольных дзяцей, што пастаянна жывуць у сталіцы. Па-другое, дзяцей-сірот і дзяцей без бацькоўскай апекі. Па-трэцяе, маладых спецыялістаў, якія навучаліся «на бюджэце» і якіх размеркавалі ў сталіцу. Па-чацвёртае, абмежаванні не маюць адносінаў да асобаў, якія былі запрошаныя (або прызначаныя), і ў тым ліку пераводам у Мінск на работу ці службу ў арганізацыях з іншых рэгіёнаў. Па-пятае, гаворка ідзе аб асобах, што былі звольненыя з вайсковай службы па ўзросце, стане здароўя ці па скарачэнні штатаў — у выпадку, калі да вайсковай службы такія асобы пражывалі ў сталіцы, або ў выпадку, калі ў Мінску пражываюць іх такія блізкія сваякі, як маці, бацька, муж, жонка, дзеці, родныя браты ці сёстры, дзед, бабка або ўнук.

Падобная ўмова вызначана і для грамадзян, якія жывуць за межамі сталіцы і працуюць на мінскіх прадпрыемствах. Прыняць у чаргу на прадпрыемствах такіх грамадзян можна таксама толькі пасля 5 гадоў працы. Аднак гэта не датычыцца дзяцей-сірот, дзяцей без бацькоўскай апекі, маладых спецыялістаў і асобаў, спецыяльна запрошаных арганізацыямі Мінска работнікаў з іншых рэгіёнаў.

Да слова, асобныя правілы ў Мінску існуюць і непасрэдна па рэгістрацыі. Калі ў астатніх рэгіёнах краіны пастаянна зарэгістравацца можна на 15 квадратных метрах агульнай «свабоднай» жылплошчы, то ў сталіцы гэта планка вышэйшая — 20 «квадратаў». Таксама ёсць пэўныя адрозненні па рэгістрацыі без метражу. Без яго ўліку ва ўсіх рэгіёнах Беларусі павінны зарэгістраваць пры пераездзе мужа да жонкі, жонкі да мужа, бацькоў да дзяцей, дзяцей да бацькоў, усыноўленых да ўсынаўляльнікаў, усынаўляльнікаў да ўсыноўленых, няпоўнагадовых грамадзян, якім вызначана апека, да апекуноў, дзеда з бабкай да ўнукаў, унукаў да дзеда з бабкай, роднага брата да роднай сястры і наадварот. У Мінску ж 20 «квадратаў» не бяруцца пад увагу толькі ў выпадку пераезду мужа да жонкі, жонкі да мужа, бацькоў да дзяцей і дзяцей да бацькоў, усыноўленых да ўсынаўляльнікаў, усынаўляльнікаў да ўсыноўленых, няпоўнагадовых грамадзян, якім вызначана апека, да апекуноў, няпоўнагадовых родных братоў і сёстраў, што не маюць бацькоў, поўнагадовых непрацаздольных родных братоў і сёстраў, што не маюць сем'яў і бацькоў, да родных бартоў і сёстраў.

***5-ГАДОВЫ МАРАТОРЫЙ***

Зрэшты, адно істотнае абмежаванне па часе застаецца і па краіне ў цэлым. У любым рэгіёне не возьмуць у чаргу на працягу 5 гадоў пры так званым «штучным пагаршэнні жыллёвых умоў». Скажам, калі грамадзянін прадаў сваю кватэру, у якой забяспечанасць агульнай плошчай перавышала 15 квадратных метраў на чалавека. Або ўсяліў у займаемае жылое памяшканне іншых грамадзян — за выключэннем выпадкаў усялення мужа ці жонкі, няпоўнагадовых непрацаздольных дзяцей, непрацаздольных бацькоў як наймальніка, забудоўшчыка, члена арганізацыі забудоўшчыкаў, так і членаў іх сем'яў.

Плюс да таго, штучным пагаршэннем жыллёвых умоў лічыцца ўсяленне ў інтэрнат, заключэнне дагавора найму жылога памяшкання ў дамах прыватнага фонду або дагавора паднайму ў дамах дзяржаўнага фонду — у сітуацыі, калі грамадзяне раней былі забяспечаныя жылым памяшканнем агульнай плошчай больш за 15 квадратных метраў на чалавека.

***ЧАМУ СПАТРЭБІЦЦА ПАДЗЕЛ?***

У выпадку, калі грамадзянін па месцы жыхарства прымаўся і працягвае знаходзіцца на ўліку сумесна з няпоўнагадовымі дзецьмі, дзеці пасля дасягнення 18-гадовага ўзросту могуць пайсці ў выканкам і вылучыцца ў асобную чаргу. Гэтаксама варыянт вылучэння ў асобную чаргу магчымы ў сітуацыі, калі падчас знаходжання бацькоў у чарзе дзеці нарадзілі самі.

— Паўтаруся, што асноўная ўмова для паляпшэння жыллёвых умоў — наяўнасць менш чым 15 квадратных метраў на чалавека, — заўважае Васіль Корсук. — Разам з тым можа здарыцца, што муж ці жонка атрымаюць кватэру ў спадчыну. У такім разе, калі дзеці будуць знаходзіцца ў чарзе разам з бацькамі, права на паляпшэнне жыллёвых умоў, хутчэй за ўсё, знікне. А калі бацькі і дзеці будуць знаходзіцца асобна, «лішнія» метры бацькоў лічыцца не будуць і права на паляпшэнне жыллёвых умоў у дзяцей паранейшаму застанецца.

Варта падкрэсліць — у выпадку падзелу чаргі сама дата прыняцця на ўлік захоўваецца. Да прыкладу, калі бацькі станавіліся ў 1990 годзе, то з 1990 года працягнуць стаяць і іх дзеці. Аднак калі дзеці нараджаліся ў перыяд знаходжання бацькоў на ўліку, то дзеці застануцца ў чарзе з даты свайго нараджэння.

***ШМАТДЗЕТНЫЯ «ІДУЦЬ» ХУТЧЭЙ***

Рух любой чаргі залежыць ад яе працягласці і магчымасцяў будаўнічых арганізацый у тым або іншым рэгіёне. Аднак у дадзеным выпадку ёсць выключэнне. Паводле слоў Васіля Корсука, вызначана: шматдзетную сям'ю павінны ўключыць у будаўніцтва не пазней чым праз тры месяцы пасля пастаноўкі на ўлік. Праўда, трэба заўважыць, што тут маецца на ўвазе чарга ў выканкаме — гаворкі аб чарзе па месцы працы не ідзе.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НА МАЦІ З СЫНАМ НАЕХАЎ АЎТОБУС «МЕРСЕДЭС»

У Крупскім раёне пад коламі аўтобуса загінулі 22-гадовая маці, якая знаходзілася ў водпуску па доглядзе дзіцяці, і яе гадавалы сын.

Гэта здарылася каля дзевяці гадзін вечара паблізу вёскі Нача. Наехаў на жанчыну з малым 29-гадовы мінчанін, вадзіцель аднаго з прадпрыемстваў. Між іншым, вясковая жыхарка і дзіця былі без флікераў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### «ШЭЎРАЛЕ-НІВА» ЎРЭЗАЛАСЯ Ў «ХУТКУЮ»



14 кастрычніка на аўтадарозе Мінск—Гродна адбыўся абуральны інцыдэнт. У Шчучынскім раёне аўтамабіль «Шэўрале-Ніва» на паласе сустрэчнага руху ўрэзаўся ў машыну «хуткай дапамогі», якая ехала па выкліку. Пасля сутыкнення УАЗ апынуўся ў кювеце. Траўмы атрымалі абодва вадзіцелі і пасажыр «хуткай».

**Алег ДУК, старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

### ПАЧАЛОСЯ КОМПЛЕКСНАЕ АПЕРАТЫЎНАЕ ВУЧЭННЕ УЗБРОЕНЫХ СІЛАЎ «ВОСЕНЬ-2008»

Агульная колькасць войскаў, якія ўдзельнічаюць у КАВ, складзе каля 8,5 тыс. чалавек. У ходзе вучэння будзе задзейнічана баявая і спецыяльная тэхніка, у тым ліку больш за 40 лятальных апаратаў (у тым ліку 12 ад ВПС Расіі), больш за 60 танкаў, каля 250 баявых браніраваных машын і да 40 артылерыйскіх гармат.

**БЕЛТА.**

### ПАМЯЦІ АХВЯРАЎ ХАЛАКОСТУ




21 кастрычніка 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь уводзіць у паштовае абарачэнне марку «Памяці ахвяраў Халакосту», падрыхтаваную ВЦ «Марка» РУП «Белпошта».

Мастак — Арцём Рыбчынскі.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯН ЧАКАЕ СКАЧОК ЦЭНАЎ

**Урад Расіі гатовы ў чарговы раз перагледзець прагноз па інфляцыі на 2008 год — на колькі, стане вядома па выніках кастрычніка, калі яе рост, як чакае Міністэрства эканамічнага развіцця, напрамую наблізіцца да верхняга парога дзеючага прагнозу.**

«У выпадку рэзкага зніжэння цэнаў на нафту, падзенне даходаў бюджэту дзяржава не зможа і далей такімі ж тэмпамі павялічваць пенсіі, зарплаты дзяржсектара. І хоць рост даходаў захаваецца, ён будзе адставаць ад росту цэнаў, а значыць, адбудзецца рэальнае пагаршэнне дабрабыту насельніцтва», — лічаць спецыялісты «Левада Цэнтра».

### ПАЛІТЫЧНЫ СКАНДАЛ У ПОЛЬШЧЫ: ПРЭМ'ЕР І ПРЭЗІДЭНТ СПРАЧАЮЦЦА ЗА КРЭСЛА



**У Польшчы працягваецца палітычны скандал: канцылярыя прэм'ер-міністра краіны Дональда Туска адмовіла прэзідэнту Леху Качынскаму ў магчымасці скарыстацца дзяржаўным спецсамалётам для паездкі на саміт ЕС у Брусэлі, паведамляе агенцтва РІА «Навіны».**

Урад не дае прэзідэнту скарыстацца ўрадавым самалётам таму, што гэта прыватная паездка кіраўніка дзяржавы, заявіў журналістам кіраўнік канцылярыі прэм'ер-міністра Томаш Арабскі. Прэм'ер Туск ужо знаходзіцца ў Брусэлі. Кіраўнік урада Польшчы прыляцеў на саміт ЕС на спецсамалёце. Меркавалася, што менавіта гэты самалёт вернецца назад у Варшаву і зноў вылеціць у Брусэль разам з прэзідэнтам Польшчы. Дональд Туск раней неаднаразова заяўляў, што не жадае бачыць прэзідэнта краіны Леха Качынскага на саміце ЕС у Брусэлі. «Скажу цвёрда — у нас з панам прэзідэнтам адчувальныя адрозненні ў поглядах на розныя пытанні. Таму мы распачалі крокі, каб польская дэлегацыя выглядала на саміце ЕС як адзіная каманда, не ведаю, што будзе рабіць тут у гэты час прэзідэнт», — заявіў ён.

### РАССЛАБЛЯЦЦА НА РАБОЦЕ КАРЫСНА

**Калі работнікі на працы расслабляюцца, гэта нярэдка выклікае абурэнне з боку калег і начальства. Тым не менш, паводле апошніх даследаванняў амерыканскіх вучоных, пераключэнне ўвагі не толькі не расхалоджвае, але і дапамагае вырашаць праблемы, піша газета The Daily Telegraph.**

Калі вы на некалькі хвілін зоймецеся іншай працай або проста адпачняце, то ваш мозг паспее «перазагрузіцца», упэўнены даследчыкі. Такім чынам, калі вы вернецеся да ранейшага задання, ваш мозг сам падкажа вам адказ на пытанне, якое вас турбуе. У якасці эксперыменту 130 добраахвотнікаў выконвалі тэст на слоўныя асацыяцыі. Палове групы прапанавалі падчас тэсту адпачыць 5 хвілін і сканцэнтравацца на чымсьці цалкам іншым. Вынікі паказалі, што катэгорыя людзей, якія факусіраваліся на розных занятках, выканала тэставае заданне значна хутчэй і больш эфектыўна, чым удзельнікі кантрольнай групы, якія працавалі без перадышкі. Дарэчы, нядаўна вучоныя з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Лос-Анджэлесе высветлілі, што інтэрнэт стымулюе работу мозга не горш, чым крыжаванкі.

### УТОЧНЕНИЕ

В опубликованной в газете «Звязда» № 195 за 15 октября 2008 года на 8-й странице Официальной таблице тиража выигрышей по выигрышным вкладам ОАО «АСБ Беларусбанк», вместо «Шестьдесят девятого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях, состоявшегося 09 апреля 2008 г. в г. Минске»

**СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ «Семидесятого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях, состоявшегося 09 октября 2008 г. в г. Минске».**

**Саковщинский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**ПО ПРОДАЖЕ 2 (ДВУХ) ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА:**

**Лот 1** — земельный участок в д. Саковщина, ул. Юбилейная, площадь участка 0,25 га, начальная цена 2 500 000 белорусских рублей.

**Лот 2** — земельный участок в д. Саковщина, ул. Юбилейная, площадь участка 0,25 га, начальная цена 2 500 000 белорусских рублей.

**Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома.** Имеется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости природный газ, на расстоянии 300 м — река Западная Березина, на расстоянии 5 км — Налибокская пуща. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3604000000482 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037249, назначение платежа 04901.

**Аукцион состоится 21 ноября 2008 года в 11.00 по адресу: д. Саковщина, ул. Первомайская, дом 18, здание сельисполкома.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 20 ноября (включительно) 2008 года до 17.00 по адресу: д. Саковщина, ул. Первомайская, 18, кабинет секретаря.

**Контактный телефон: 8 01772 39 1 58. Минская область, Воложинский район, д. Саковщина, ул. Первомайская, 18.**




***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.10.2008 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 114,00 |
| 1 еўра | 2 875,78 |
| 1 латвійскі лат | 4 058,75 |
| 1 літоўскі літ | 832,87 |
| 1 чэшская крона | 116,72 |
| 1 польскі злоты | 817,19 |
| 1 расійскі рубель | 80,89 |
| 1 украінская грыўня | 413,29 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,1347 |
| 10 UAH | 50,8952 |
| 1000 BYR | 12,3656 |
| EUR | 35,5798 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 15.10.2008 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

08196 -

# МАТЧЫНА РАДАСЦЬ

**У Крычаве ў Палацы Пацёмкіна адкрыўся Музей Маці. Гэта адбылося ў знамянальны дзень 14 кастрычніка — на Пакроў Багародзіцы і Дзень маці.**

У галоўным помніку архітэктуры Крычава месціцца раённы аддзел ЗАГС, і цяпер праз Музей Маці праходзяць маладыя, якія бяруць шлюб. Жаніха і нявесту тут сустракае абраз Божай Маці, праводзіць — беларускі ручнік, які яднае мінулае і сучаснае.

— Мы хочам паказаць у гэтым музеі ролю жанчыны-маці ў гісторыі і сучаснасці, і гэта роля — самая галоўная, — лічыць дырэктар Крычаўскага краязнаўчага музея Наталля Марозава.

Адзін з самых цікавых гістарычных экспанатаў — гэта асабістыя рэчы савецкай лётчыцы Веры Фёдараўны Ламакі. Яна ў вайну камандавала мужчынскім авіяцыйным палком і лятала на самалёце «Крычаўскі чыгуначнік». Калі яна знаходзілася ўжо ў Германіі, то для крычаўскіх дзяцей, якія выжывалі ў разбураным вайной горадзе, накіравала вялікую колькасць адзення.

У экспазіцыі Музея Маці ёсць і сучасныя фотаздымкі — напрыклад, з дзіцячага дома сямейнага тыпу ў вёсцы Касцюшкавічы. Валянціна Мікалаеўна Добрусева выхоўвае васьмярых дзяцей: дваіх сваіх і шасцярых прыёмных. Калісьці яна пры падтрымцы мужа вырашыла ўзяць прыёмнае дзіця: супругі паехалі за адным, а забралі чацвярых.

— Таму што не маглі кінуць братоў і сясцёр, якія ляжалі ў бальніцах, з часоткай і вошамі, — проста тлумачыць прыёмная маці, якая прыехала на адкрыццё музея. — І мы з мужам пашкадавалі гэтых дзяцей. Яны нам кранулі душы. Малыя не ведалі, што такое кавун — і спачатку елі яго з лупінай. Я працавала псіхолагам у школе і ведала, як прыходзіцца дзецям нядбайных бацькоў. Муж Сяргей вырас у праблемнай сям'і. І мы вырашылі: няхай хоць гэтыя дзеці будуць шчаслівыя.

Калі шчыра, то многіх знаёмых шакіравала такое рашэнне жанчыны, у якой ужо былі добрая сям'я, праца і дабрабыт. Але прайшлі гады і ўсе зразумелі, што сапраўднае прызначэнне Валянціны Мікалаеўны — гадаваць дзяцей, быць ім добрай маці.

Клопатаў у жыцці Добрусевай, зразумела, прыбавілася. Гаспадарка сямейнага дзіцячага дома — як невялікі калгас. Палеткі і жывёла. Тры каровы і шэсць свіней. Курэй, індыкаў і трусоў не лічаць. Усяго павінна быць па максімуму, каб вялікая сям'я магла пракарміцца. Плюс яшчэ дзіцячы «статак» з катоў і сабак — дзеці рэгулярна падбіраюць на вясковых вуліцах бяздомных жывёл і прыносяць у дом.



У вялікай сям'і Валянціны і Сяргея ДОБРУСЕВЫХ няма падзелу на сваіх і прыёмных, а дзеці такія дружныя, што роўна дзеляць на ўсіх адну цукерку.



Музей Маці размясціўся ў Палацы Пацёмкіна — галоўным архітэктурным помніку Крычава.

— Мне ўсё гэта не цяжка, — гаворыць маці. — У мяне вельмі добрыя дзеці, яны добра вучацца і ва ўсім мне дапамагаюць. Ведаеце, я нядаўна прыхварэла: ляжу на канапе, а дзеці селі на падлогу вакол мяне і так сядзелі. Мне баліць, а я шчаслівая. Таму што яны не пайшлі гуляць у футбол ці чай піць на кухню, а хваляваліся за мяне. Я задаволеная сваімі дзецьмі і жыццём. Калі б пачынаць усё наноў — зрабіла так жа сама. Усё ж такі дзеці — гэта самае галоўнае, радасць і шчасце наша. І мне вельмі прыемна бачыць у Музеі Маці сваю сям'ю.

Валянціна Мікалаеўна Добрусева разам са старшынёй Крычаўскага райвыканкама Іванам Пракопавым перарэзалі чырвоную стужку на знак адкрыцця Музея Маці.

У Палацы Пацёмкіна адбыўся традыцыйны ўрачысты прыём з нагоды Дня маці. Іван Пракопаў асабіста павіншаваў са святам 41 маці, для кожнай гаспадыні і працаўніцы знайшліся добрыя словы.

— Музей Маці — гэта даніна павагі ўсім маці Крычаўскага раёна, — сказаў кіраўнік райвыканкама.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ДОБРА СУСЕДУ — РАДАСНА МНЕ?

## Мяняецца жыццё — мяняемся мы

**«Сябры пазнаюцца ў бядзе» — выслоў'е даволі папулярнае, але даводзіцца чуць, што калі хочаш ведаць, хто твой вораг, то стань багатым**

Сустрэўся з камбайнерам, які ў свой час выйшаў пераможцам і на Дажынках атрымаў аўтамашыну. Падчас размовы пачуў тое, што мяне не здзівіла.

— Прыгнаў машыну і, як у такіх выпадках бывае, з мужыкамі па рабоце яе добра «абмылі» і ніякіх праблем — усе вельмі прыязна ўспрынялі маю ўзнагароду. Не ведаю, што гаварылі за спінаю, але ж калі чалавек нешта супраць мае, то схаваць цяжка. А вось сваякі і суседзі змяніліся — быццам кошка між намі прабегла. Прыехаў да сястры, а швагер выйшаў на ганак, зірнуў на легкавушку і з твару змяніўся — пабялеў. Сусед жа не ўстрымаўся: «Падфарціла, дасталася дармавая». Неяк зазірнуў брат і кажа: «Падкінь да Брэста — трэба да знаёмага». А гэта 150 км у адзін бок, ды і па горадзе мне ездзіць няпроста. «Я лепш табе дарогу аплачу ды яшчэ і на таксі дам, толькі не валтузь мяне», — адказваю. «Можна падумаць, што зарабіў... А што іншыя горш рабілі?» — пакрыўдзіўся брат і па сённяшні дзень не гаворыць. Што і да чаго гэта? А бацька растлумачыў: «Ды яны ж цяжка перажываюць».

Знаёмая расказвала пра свайго суседа па пад'ездзе, які як толькі ўбачыць, што нехта штосьці салідная купіў — суткі пластом ляжыць, хварэе. А ўлічваючы, што ў пад'ездзе пятнаццаць кватэр, то чалавек з хворага стану не выходзіць, бо людзі пастаянна нешта купляюць.

«Жаба душыць», — кажуць пра зайздрослівага чалавека, і не дзіўна, што ён адчувае сябе не камфортна, не мае душэўнага спакою, і праблемы з сэрцам тут не выключаны. Як важна жыць у гармоніі з навакольным светам, мець унутраную раўнавагу.

І калі чалавек парадаваўся чужой удачы — ён ужо падняўся на больш высокую ступень самаўдасканалення. Але пераступіць мяжу, падняцца над зайздрасцю можа далёка не кожны, бо гэтая загана закладзеная ў натуры чалавека прыродай і ў пэўнай меры тут адклала свой адбітак спрадвечная нястача і галеча.

Даўно заўважана, што ў людзей, якія жывуць заможна, зайздрасць так не адчуваецца, хоць там хапае іншага, напрыклад, у нечым «пераплюнуць» адзін другога.

А ці пазнаюцца сябры ў бядзе?

Калі чалавек пры ўладзе ці пры вялікіх грашах, то ад «сяброў» ратунку няма. А згубіў ён сілу, і «сябры» зніклі — у лепшым выпадку, а іншы і ворагам стаў. Безумоўна, ёсць і тыя, хто мае гонар і не мяняе сваіх поглядаў на жыццё, але ці шмат такіх?

У аднапакаёвай кватэры жыла жанчына з дачкой-інвалідам і многія ў пад'ездзе спачувалі і дапамагалі. Адзін сусед агароднiны прынясе, а другі — садавіны. Бачылі, што цяжка ўдаве прыходзіцца, а можа нехта ўяўляў сябе на яе месцы. Але памёр адзінокі сваяк, і жанчыне дасталася ў спадчыну кватэра. І скончыліся ў пад'ездзе спачуванні і дапамога. Калі раней суседкі маглі і пасядзець з дачкой, то цяпер ні ў кога не стала часу.

Яшчэ студэнтам даводзілася часта бываць у Грузіі — там жылі бацькі жонкі. Неяк паехаў з цесцем у горы да знаёмага грузіна. Ідзём з ім па сяле, і нас у госці запрашаюць, то ў адзін дом, то ў другі, а калі заходзім, то нешта гаварылі па-грузінску і віно налівалі. Аказалася, што ў нашага знаёмага сын у інстытут паступіў і гэта жыхары вуліцы бацьку віншавалі.

— У нас няма вашых грошай, каб дзяцей вучыць, — даводзілася чуць за савецкім часам ужо ад нашых. Хоць тады хто хацеў вучыцца, мог паступіць.

У кожнага народа свае «мухі». Тыя ж грузіны любяць пахваліцца. У аднаго прадзед быў князем, а ў другога — грошай «куры не дзяўбуць». Беларус, як правіла, прыбядняецца, скардзіцца, цiснецца, а здарыўся фінансавы абвал, то ў «бедных» прапала — 5, 10, 25 і 50 тысяч савецкіх.

Дарэчы, народы найперш адрозніваюцца не мовай і веравызнаннем, а псіхалогіяй — успрыманнем свету. Мова адна і рэлігія тая ж, а народы розныя.

Безумоўна, зайздрасць — кепска, але працавітасць нашых людзей, хоць часам і бяздумная, ураўнаважвае сітуацыю.

Свет вялікі ды разнастайны, і мы ў ім не горшыя. Толькі і наш народ пачаў мяняцца. Маладое пакаленне пазбаўляецца «зубнога налёту» (біблейскае) бацькоў і дзядоў. Галеча адышла ў мінулае, беднасць ёсць, але пахіленыя хаткі з глінянай падлогай зніклі, і настане час, калі мы будзем радавацца, што ў суседа ўсё добра.

Жыць без зайздрасці — гэта дні доўгія, а ночы кароткія і спакой на душы.

Радуе, што ўжо можам пасмяяцца над сваімі слабасцямі, а гэта прыкмета таго, што ўсё ў нас будзе добра.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**«19» ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион**

**по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Слуцкого района, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания**

**На аукционные торги выставляются:**

| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 | Лот № 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | **здание хранилища № 10089 (инв. № 640/С-26359) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** | **здание склада № 10031 (инв. № 640/С-26242) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** | **здание хранилища техники № 100158 (инв. № 640/С-17532) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** | **здание склада ГСМ (инв. № 640/С-31015) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** | **здание склада № 10030 (инв. № 640/С-26241) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** |
| **Местоположение недвижимого имущества** | Минская область, г. Слуцк, ул. Гагарина, 12 в/г | Минская область, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 13 в/г | Минская область, г. Слуцк, ул. Гагарина, 12 в/г | Минская область, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 13 в/г | Минская область, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 13 в/г |
| **Начальная цена предмета аукциона, рублей** | 277 673 220 (в том числе: недвижимое имущество – 164 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 113 673 220) | 102 183 750 (в том числе: недвижимое имущество – 62 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 40 183 750) | 269 091 860 (в том числе: недвижимое имущество – 139 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 130 091 860) | 71 715 640 (в том числе: недвижимое имущество – 24 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 47 715 640) | 103 989 500 (в том числе: недвижимое имущество – 65 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 38 989 500) |
| **Сумма задатка для участия в аукционе, рублей** | 15 000 000 | 10 000 000 | 15 000 000 | 7 000 000 | 10 000 000 |
| **Характеристика недвижимого имущества** | Общая площадь 1607,9 кв.м. Одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша совмещенная, полы бетонные. Инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки – 1972. | Общая площадь 698,4 кв.м. Одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша битумно-рубероидная, полы бетонные. Инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки – 1976. | Общая площадь1584,0 кв.м. Одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша совмещенная, полы бетонные. Инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки – 1972. | Общая площадь 267,7 кв.м. Одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша битумо-рубероидная, полы бетонные. Инженерное оборудование отсутствует. Год постройки – 1976. | Общая площадь 705,2 кв.м. Одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша битумно-рубероидная, полы бетонные. Инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки – 1975. |
| **Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества** | Срок аренды земельного участка – 25 лет, площадь 0,6238 га. Введено ограничение в использовании части земельного участка 0,0094 га в связи с расположением его в охранной зоне линий электропередач. | Срок аренды земельного участка – 25 лет, площадь 0,2961 га. | Срок аренды земельного участка – 25 лет, площадь 0,7139 га. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в охранной зоне линий электропередач. | Срок аренды земельного участка – 25 лет, площадь 0,3516 га. | Срок аренды земельного участка – 25 лет, площадь 0,2873 га. |
| **Условия использования земельного участка** | Для размещения производственно-складского объекта с санитарно-защитной зоной 50 м, административно-бытовых и торговых помещений, а также помещений бытового обслуживания населения. | Для размещения производственно-складского объекта с санитарно-защитной зоной до 100 м, а также административно-бытового либо торгового объекта. | Для размещения производственно-складского объекта с санитарно-защитной зоной 50 м, административно-бытовых и торговых помещений, а также помещений бытового обслуживания населения. | Для размещения объектов промышленно-складского назначения с санитарно-защитной зоной от жилья 50 м, либо объекта соцкультбыта. | Для размещения производственно-складского объекта с санитарно-защитной зоной до 100 м, а также административно-бытового либо торгового объекта. |
| **Продавец недвижимого имущества** | **Коммунальное унитарное производственное предприятие «Слуцкое ЖКХ», Минская область, г. Слуцк, ул. Пионерская, 23, тел. (8 01795) 56083** | | | | |
| **Арендодатель земельного участка** | **Слуцкий районный исполнительный комитет, г. Слуцк, ул. Ленина, 189** | | | | |

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Слуцким райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

**Все расчеты по сумме задатка производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

**Заявление на участие в аукционе принимается ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявлений 17 ноября 2008 г. до 13.00.**


Надзея КАТКАВЕЦ, першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:

**Сёння — сусветны дзень харчавання**

# «УСЕ ЛІШКІ ПРАДУКЦЫІ ВЯСКОЎЦЫ БЕЗ ПРАБЛЕМ ПАВІННЫ РЭАЛІЗАВАЦЬ»

**Па выніках васьмі месяцаў удалося дасягнуць паказчыка экспарту сельгаспрадукцыі, які склаўся за ўвесь мінулы год, — 1,2 мільярда долараў. Сёлета станоўчае сальда знешняга гандлю павінна выйсці на 780 млн долараў.**

Асноўны рынак, куды беларускія вытворцы пастаўляюць харчаванне, — расійскі. Аднак асобныя рэгіёны РФ апошнім часам самастойна задавольваюць уласныя патрэбы. Да прыкладу, у Белгародскай вобласці выпрабляюць курацiны столькі, што не толькі самім хапае, але яшчэ і на экспарт пастаўляюць. Як лічыць Надзея Каткавец, беларускія вытворцы павінны ва ўстаноўленым парадку пацвярджаць якасць сваёй прадукцыі. Партыі, якія адпраўляюцца ў Расію, трэба суправаджаць пакетам неабходных дакументаў. Інспектаванне перапрацоўчых прадпрыемстваў прыносіць карысць — дазваляе падцягнуць тэхнічны, тэхналагічны ўзровень айчынных мясакамбінатаў і малочных заводаў.

Мінсельгасхарч паставіў задачу, каб суб'екты гаспадарання больш актыўна займаліся дыверсіфікацыяй экспартных паставак. Кожнае прадпрыемства павінна асвоіць як мінімум некалькі новых краін. Варта пашыраць геаграфію паставак, якая, па словах Надзеі Каткавец, сёлета нават звузілася. Праўда, ёсць пазітыўныя моманты — экспартавана першая партыя сухога малака ў Венесуэлу, прапрацоўваюцца варыянты для адпаведных кантактаў з Іранам.

**Асабістыя гаспадаркі вяскоўцаў неабходна забяспечыць сродкамі малой механізацыі. Магчыма, будзе выпрацаваны і адпаведны механізм ільготнага крэдытавання закупкі тэхнікі.**

На жаль, у вёсцы адчуваецца пэўны дэфіцыт працоўных рэсурсаў. Як заўважыла Надзея Каткавец, «мы не можам утрымаць маладых спецыялістаў». Паводле даных спецыяльнага сацыялагічнага апытання (яно праводзілася сярод выпускнікоў сельскагаспадарчых ВНУ), сярод фактараў, якія, на думку рэспандэнтаў, здольныя павялічыць прэстыжнасць працоўнага месца, галоўны — заработная плата. Таксама сярод прыярытэтаў — магчымасць вырашэння жыллёвага пытання, перспектыва кар'ернага росту. Верхняя мяжа заробкаў у маладога спецыяліста, як правіла, вагаецца ў межах 400 тысяч рублёў. Сярэдні ўзровень аплаты працы па АПК цяпер складае 440 тыс. рублёў. Як упэўнена Надзея Каткавец, сітуацыю неабходна мяняць.

Павелічэнне закупачных цэнаў на сельскагаспадарчую прадукцыю, на думку першага намесніка міністра, — аб'ектыўная неабходнасць. Паколькі ўвесь час павышаецца кошт на матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы, якія спажываюць аграпрамысловыя прадпрыемствы. Да прыкладу, апошняе павелічэнне расцэнак на фосфарныя ўгнаенні склала 56 працэнтаў. Каб вытрымаць усе такія ўзрушэнні, патрэбна прытрымлівацца такой цэнавай палітыкі, якая б максімальна ўлічвала інтарэсы вытворцаў і спажыўцоў.

У структуры валавой вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі каля 40 працэнтаў прыпадае на прысядзібныя гаспадаркі. Як заўважыла Надзея Каткавец, асабістыя гаспадаркі вяскоўцаў неабходна забяспечыць сродкамі малой механізацыі. Магчыма, будзе выпрацаваны і адпаведны механізм ільготнага крэдытавання закупкі тэхнікі. Павінны быць створаны ўчасткі па аказанні паслуг вяскоўцам (у тым ліку і работы па апрацоўцы палеткаў). Насенне, мінеральныя ўгнаенні трэба рэалізоўваць праз крамы. Як заўважыла Надзея Каткавец, адна з асноўных задач — стварыць такую сістэму, каб усе лішкі вырашчанай прадукцыі вяскоўцы без праблем маглі б прадаць максімальна блізка ад таго месца, дзе яны жывуць.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## Здароўе на талерцы

# ХРЭН — ПРЫПРАВА-АФРАДЫЗІЯК

**Хрэн — вельмі вядомая расліна, адна з лепшых пікантных, пажыўных і лекавых прыпраў. Па сваіх вартасцях ён перасягае гарчыцу і здольны ўнесці разнастайнасць у стравы, якія ўжо «прыеліся». Хрэн добры і з поснай, і з тлустай ежай. І з рыбай, і з мясам, і з маслам, і са смятанай. Усяго не пералічыш. Невялікая порцыя кашкі, якая б'е ў нос ядраным пахам і выклікае слёзы на вачах, узбуджае апетыт і садзейнічае выдзяленню страўнікавага соку. Гэта не толькі гурманы, але і ўрачы сцвярджаюць. Востры смак і спецыфічны водар прыправе надае глiказiд сінігрын (эфірны гарчычны алей).**

Калі ж гаварыць пра ўтрыманне біялагічна актыўных рэчываў у хрэне, дык іх у яго мноства: вугляводы, тлушчы, смалістыя і азоцістыя рэчывы, аскарбінавая кіслата, карацін, фоліевая кіслата, цукры, клятчатка. Такога багацця пажыўных рэчываў няма нават у капусце і моркве, а па ўтрыманні вітаміну С хрэн апярэджваюць толькі шыпшына і чорныя парэчкі. Хрэн багаты на калій, кальцый, натрый, серу, фосфар, жалеза. У свежым соку хрэну змяшчаецца значная колькасць лізацыму — бялковага рэчыва, якое валодае здольнасцю раствараць мікробныя абалонкі, ствараючы такім чынам антыбактэрыяльны бар'ер у арганізме. Таму медыкі раяць уключаць хрэн у свой рацыён у халодную пару года для папярэджання прастуды.

І яшчэ адна адметнасць хрэну. Дзякуючы багатаму біяхімічнаму складу, гэта расліна лічыцца выдатным афрадызіякам — прадуктам, які ўзбуджае і павышае палавую актыўнасць.

У народзе здаўна ведаюць і цэняць лекавыя ўласцівасці хрэну, але тут ёсць і свае абмежаванні. Людзям з хваробамі нырак, печані, падстраўнікавай залозы, а таксама пры гастрыце з павышанай кіслотнасцю, язвавай хваробе і каліце хрэн ужываць проціпаказана.

**БАЛЬЗАМ СУПРАЦЬ АТЭРАСКЛЕРОЗУ**

Вазьміце 1 л сухога віна, 1 кг цукру, 100 г дзёртага хрэну, 0,5 кг апельсінаў, здробненых разам з лупінай. Сумесь на працягу гадзіны варыце на вадзяной лазні, астудзіце і трымайце ў халадзільніку. Прымайце па 2 ст. лыжкі 3 разы на дзень праз гадзіну пасля яды.

**САЛАТА З ЯБЛЫКАЎ І МОРКВЫ**

1 корань хрэну, 1 морква, 3 яблыкі, 1/2 шклянкі смятаны, сок лімона

Хрэн і моркву надзярыце на тарцы, яблыкі нарэжце саломкай, усё перамяшайце і паліце сокам лімона. Перад ужываннем дадайце цукар, соль на смак, запраўце смятанай.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**




**ФАРШЫРАВАНЫЯ ПАМІДОРЫ З МЯСАМ**

Нам спатрэбіцца: 8 памідораў, 250 г мяснога фаршу, 2 ст. лыжкі варанага рысу, 1 зубок часнаку, зяленіва пятрушкі, соль, перац молаты, маянэз, дзёрты сыр — на смак.

Вымыйце памідоры, акуратна зрэжце верх і чайнай лыжкай дастаньце асяродак. Фарш трэба абсмажыць амаль да гатоўнасці, прыправіўшы соллю, перцам, дробна нарэзаным зяленівам. Каб фарш не прыліпаў да дна патэльні, дадайце крыху алею або вады. Затым дадайце да мяса 3—4 ст. лыжкі размятага асяродку таматаў, вараны рыс і добра перамяшайце. Вогнетрывалую форму для запякання змажце алеем. Кожную памідорку напоўніце прыгатаваным фаршам, пасыпце дзёртым сырам, пакладзіце лыжачку маянэзу, зверху на кожны памідор пакладзіце яго зрэзаную частку. Размяты асяродак таматаў разбаўце вадой і наліце на дно формы, пастаўце ў гарачую духоўку і тушыце да гатоўнасці.

**ВАРЭННЕ З ЗЯЛЁНЫХ ПАМІДОРАЎ**

Сама я такога варэння ніколі не рабіла, але мама маёй інстытуцкай сяброўкі варыла яго цудоўна, атрымліваецца вельмі прыгожа, а на смак нагадвае мёд.

Нам спатрэбіцца: 1 кг яшчэ зялёных (малочнай спеласці) дробных памідораў слівападобнай формы, 1,2 кг цукру, 300 г вады.

Памідоры мыем, перабіраем і складваем у шырокі таз для варэння. З цукру і вады гатуем сіроп. Ахалоджваем яго. Заліваем памідоры ахалоджаным сіропам і пакідаем на суткі. Сіроп зліваем і кіпяцім. Заліваем кіпячым сіропам памідоры яшчэ на суткі. Зноў зліваем сіроп, кіпяцім і, не ахалоджваючы, заліваем памідоры. Ставім на маленькі агонь і варым да мяккасці пладоў.

**ЗАПЕЧАНЫЯ ЗЯЛЁНЫЯ ПАМІДОРЫ З АРЭХАВАЙ ПРЫПРАВАЙ**

Нам спатрэбіцца: 5 зялёных памідораў, 3/4 шклянкі ачышчаных грэцкіх арэхаў, 10—12 галінак зяленіва пятрушкі або сельдэрэю, 3 зубкі часнаку, стручковы перац, яблычны воцат, соль.

Да дробна нарэзанага зяленіва дадаць соль, тоўчаны часнок, стручковы перац і добра перамяшаць. Нафаршыраваць масай зялёныя памідоры, у якіх папярэдне зрабіць надрэз. Выкласці памідоры ў адзін рад на патэльню і запячы ў духоўцы. Ачышчаныя грэцкія арэхі, соль, часнок, стручковы перац добра расцерці і развесці яблычным воцатам на смак. Гатовыя памідоры густа абмазаць прыправай. Падаць гарачымі.

**ЯДОМЫ АНЕКДОТ**

Амерыка вядзе дзве вайны — з тэрарызмам і з атлусценнем. Асаблівая ўдача — калі трапляюцца тлустыя тэрарысткі.

* * *

Кулінарны тэхнікум запрашае людзей для навучання па спецыяльнасцях: менеджар другіх страў, дылер супоў, спецыяліст па маркетынгу кампоту, дызайнер бутэрбродаў.

## Падрабязнасці

# КОЛЬКІ КІЛАМЕТРАЎ КАБЕЛЮ ВЫЦЯГНУЛІ?

**У адказе на гэтае пытанне кардынальна разышліся пункты погляду абвінавачання і абароны па справе аб крадзяжы непрыдатнага кабелю. Супрацоўнікі гомельскага філіяла «Белтэлекама» тры гады здзяйснялі планавыя работы ў каналізацыйных калодзежах і адначасова выцягвалі з іх тэлефонныя кабелі, якія адслужылі свой тэрмін. Потым як лом каляровых металаў здавалі ў нелегальныя скупкі, а адтуль вывозілі ў Расію.**

Паўтара года ішло следства аб крадзяжы непрыдатнага кабелю. Яго вынікі — 7 тамоў крымінальнай справы. Судом Чыгуначнага раёна Гомеля 16 супрацоўнікам прадпрыемства прад'яўлена абвінавачванне ў арганізацыі злачыннай групы і крадзяжы тэлефоннага кабелю на суму 160 мільёнаў беларускіх рублёў. Вынясенне прысуду пераносілася некалькі разоў і вось нарэшце ён абвешчаны. Пяць гадоў пазбаўлення волі — максімальны тэрмін і адзін год выпраўленчых работ — мінімальны — такія пакаранні атрымалі асуджаныя.

— Пазіцыя пракуратуры, дзяржаўнага абвінавачання некалькі адрознівалася ад пазіцыі суда — яна была больш жорсткай, як па кваліфікацыі, так і па меры пакарання, — адзначыў пракурор аддзела па забеспячэнні ўдзелу пракурораў у разглядзе судамі крымінальных спраў пракуратуры Гомельскай вобласці Дзмітрый Дзебой. — Але суду прадастаўлена права па асабістым меркаванні змяняць кваліфікацыю і назначаць пакаранне па сваім суб'ектыўным перакананні і гэтым правам суд скарыстаўся. Пры назначэнні пакарання суд прымяніў прынцып індывідуалізацыі. Было ўлічана ўсё — і асобы абвінавачаных, і цяжкасць учыненага, і самае галоўнае, актыўнае садзейнічанне раскрыццю злачынстваў, супрацоўніцтва са следствам, і на гэтай падставе ў дачыненні да двух абвінавачаных было прызначана пакаранне ніжэйшае за ніжэйшую мяжу.

Адвакат аднаго з абвінавачаных у арганізацыі злачыннай групы Жанна Ждановіч прытрымліваецца іншай пазіцыі:

— Мы лічым, што следствам і судом не даказана, што мой падабаронны арганізаваў злачынную дзейнасць па крадзяжы кабелю. Уся справа заснаваная толькі на прызнаннях абвінавачаных. А яны прызналіся ў крадзяжы такога аб'ёму кабелю, якога не было ў наяўнасці. Абарона прасіла правесці па справе бухгалтарскую экспертызу — яна не была праведзена.

Усе бакі лічаць, што кропку ў справе ставіць рана — прысуд будзе абскарджаны ў касацыйным парадку абвінавачанымі ў наступнай інстанцыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


ОАО «Минский приборостроительный завод»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:**

**Лот 1 Автомат токарный ТД-26 – 2 шт**
Начальная цена 1 200 000 бел. руб. с НДС

**Лот 2 Верстак слесарный ВС-24 – 4 шт**
Начальная цена 100 000 бел. руб. с НДС каждый

**Лот 3 Токарно-винторезный станок 1К62Д**
Начальная цена 2 700 000 бел. руб. с НДС

**Лот 4 Радиально-сверлильный станок 2А53**
Начальная цена 1 200 000 бел. руб. с НДС

**Лот 5 Ножницы кривошипные листовые Н-475**
Начальная цена 1 300 000 бел. руб. с НДС

**Лот 6 Ножницы кривошипные НК3418**
Начальная цена 2 800 000 бел. руб. с НДС

**Лот 7 Вальцы гибочные и правильные**
Начальная цена 900 000 бел. руб. с НДС

**Лот 8 Абразивно-обрезной станок ОМ-2028**
Начальная цена 700 000 бел. руб. с НДС

**Лот 9 Горизонтально-расточной станок**
Начальная цена 8 100 000 бел. руб. с НДС

**Лот 10 Микроскоп НЕОФОТ-21**
Начальная цена 820 000 бел. руб. с НДС

**Лот 11 Станок для резки фланцев ОМ-1047**
Начальная цена 300 000 бел. руб. с НДС

**Лот 12 Станок для изготовления фланцев из уголков КО-0027**
Начальная цена 1 400 000 бел. руб. с НДС

**Лот 13 Стол регулировщика – 10 шт**
Начальная цена 90 000 бел. руб. с НДС

**Лот 14 Продольно-строгальный станок 7212**
Начальная цена 12 400 000 бел. руб. с НДС

**Лот 15 Аппарат кассовый «Орион-110Ф»**
Начальная цена 360 000 бел. руб. с НДС

**Лот 16 Намоточный станок AWWA – 4 шт**
Начальная цена 60 000 000 бел. руб. с НДС

**Лот 17 Станок для намотки малых якорей**
Начальная цена 40 000 000 бел. руб. с НДС

**Лот 18 Эл. пневматический регулятор клапана**
Начальная цена 260 000 бел. руб. с НДС

**Лот 19 Бетоносмеситель БГ-100**
Начальная цена 200 000 бел. руб. с НДС

**Всю необходимую информацию можно получить**

**по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.**

**Контактный телефон 8 (0172) 93 94 33. Факс 331 41 97.**

**Аукцион состоится 17 ноября 2008 г. в 13.00.**

**по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14 ноября до 16.30 .**

УНП 100363840



# СВЯТА ВЯСЕЛЛЯЎ





**Да 16 лістапада ў мастацкай галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці ў рамках арт-праекта «Беларускі стыль» будзе працаваць выстава «Беларускае вяселле: традыцыі і сучаснасць».**

Паводле слоў куратара выставы, загадчыка аддзела традыцыйнага мастацтва Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Наталлі Сухой, выстава ўнікальная перш за ўсё тым, што арганізатары — «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» — моладзь з вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, якая цікавіцца этнаграфіяй краіны, вандруе па вёсках Беларусі і збірае песні, традыцыі, займаецца рамёствамі.

«Восень — свята вяселляў, — дадае Наталля Сухая, — бо менавіта ў гэты час сабраны ўраджай, ёсць багацце ў хаце».

**На здымках:**

З традыцыйнымі вясельнымі спевамі на адкрыцці выставы гасцей знаёміў гурт архаічнай абрадавай песні «Guda».

Сімвал чысціні — старажытная дзяжа. Падчас вяселля калі маладая была «чыстай, цнатлівай», яе ўсаджвалі менавіта на дзяжу, калі не — то на лаўку. Яшчэ адзін вясельны сімвал — пояс. Менавіта ён быў самым распаўсюджаным падарункам — маладая дарыла пояс свекрыві, уваходзячы ў новую хату, павязвала пояс на венік, «каб любіла кароўка» — звязвала поясам рогі.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

Ёсць нагода

# Дзень, якога чакае Шэф

**16 кастрычніка адзначаецца сусветны Дзень Шэфа. Прайшло роўна паўстагоддзя, як гэтае свята было прапанавана для адзначэння амерыканскай сакратаркай, а ў 1962 годзе яго нават афіцыйна зацвердзілі — спачатку толькі ў штаце Ілінойс, але неўзабаве і ў многіх краінах свету. Цяпер Дзень Шэфа святкуюць увогуле ўсе кіраўнікі і падначаленыя, хто толькі ў курсе існавання падобнага свята. У Расіі, напрыклад, апошнія некалькі гадоў нават уручаецца прэмія «Шэф года».**



Адмыслова да свята эксперты рэкрутынгавых кампаній склалі своеасаблівы рэйтынг, у якіх краінах свету падначаленыя больш за ўсё задаволеныя сваімі босамі. У апытанні бралі ўдзел менеджары сярэдняга звяна з 28 краін свету, ацэньваючы якасці кіраўніцтва па шкале ад 1 да 10. Варта адзначыць, што найбольшыя і найменшыя балы не былі выстаўлены ў ніводнай краіне. Аказваецца, найбольшай сімпатыяй карыстаюцца шэфы ў Мексіцы (ацэнка 7,6), ЗША (7,3) і Канадзе (7,2). У Еўропе вельмі станоўча ставяцца да сваіх начальнікаў ірландцы, бельгійцы і галандцы (6,7—7 балаў). Апошнія ж месцы ў міжнародным «рэйтынгу лаяльнасці» занялі шэфы з Германіі, Італіі, Турцыі і Швецыі.

У Расіі стаўленне да кіраўніцтва вызначалася іншымі шляхамі — на адным з інтэрнэт-форумаў наведвальнікам прапаноўвалася параўнаць свайго начальніка з вядомым экранным вобразам. Высветлілася, што некалькі тысяч апытаных пры словах «шэф, бос, начальнік» узгадваюць:

1) «нашу мымру» з к/ф «Службовы раман»,
2) начальніка-прараба з камедыйнага сіткома «Наша Russia»,
3) няўлоўнага «шэфа Міхал Іваныча» з к/ф «Брыльянтавая рука»,
4) адначасова вайскоўца і аналітыка, «шэфа гестапа Мюлера» з к/ф «Сямнаццаць імгненняў вясны»,
4) дзелавітага Шэфа з мультфільма «Следства вядуць Калабкі».

Магчыма, у гэты спіс трапляе і ваш начальнік, а магчыма, ягоны стыль кіраўніцтва непаўторны і ні да чаго не падобны. У любым выпадку, не забудзьцеся яго павіншаваць — толькі абавязкова шчыра, ад душы!

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

ФАРМАТнём

# ВОСЕНЬСКІ НЕСПАКОЙ

**З 16 па 19 кастрычніка ў Мінску ў кінатэатрах «Аўрора», «Мір», «Перамога» і «Цэнтральны» ў чарговы раз пройдзе эксклюзіўны паказ фільмаў у рамках праекта «КІНАфармат 4х4».**

Новую кінадраму **«На краі раю»** прапануюць увазе гледачоў кінамайстры Германіі, Італіі і Турцыі. Пастаноўку ажыццявіў па сваім сцэнарыі рэжысёр Фаціх Акін, чый фільм «Галавой аб сцяну» на МКФ у Берліне быў удастоены «Залатога мядзведзя».



Фраў Сюзана — кансерватыўная немка, якая не адабрае дружбу сваёй дачкі Лотэ з радыкальнай актывісткай-лесбіянкай Айтэн. Гісторыя пачынаецца з таго, што на пошукі Айтэн ляціць з Германіі ў Стамбул юнак Нежат. Яму стала вядома, што яна з'яўляецца дачкой нядаўна памерлай сяброўкі яго бацькі. Але палітычна актыўная дзяўчына ўжо даўно збегла з Турцыі.

У галоўных ролях: Нургуль Йесі, Ханна Шыгула, Бакі Даўрак, Тунсел Курціз. Карціна намінавалася на прэмію «Оскар», а на МКФ у Канах удастоена прыза за лепшы сцэнарый.

У іспанскай камедыйнай меладраме **«Неспакойная Ганна»** асабліва адчуваецца медыцынская адукацыя сцэнарыста і рэжысёра Хуліо Медэма. Перад намі адкрываюцца глыбіні падсвядомасці гераіні, прадстаўленыя главамі з яе жыцця.



Васямнаццацігадовай Ганне трэба даказаць сабе і іншымі, што яна не падобная на жанчын, якія жывуць у яе памяці; ёй трэба вярнуць каханага Саіда, які ўцёк, спалохаўшыся дзіўнага пераўвасаблення каханай. Галоўная гераіня гаворыць ледзь не ад асобы ўсіх жанчын, аплаквае іх боль і гарыць жаданнем адпомсціць. Жаночыя пакуты ўзводзяцца ў ступень і становяцца тэмай усяго фільма, гвалт — прычынай феміністкіх выпадаў.

У ролі Ганны знялася Мануэла Вельес, у астатніх — Шарлота, Рэмплінг, Бебе, Нікаля Казале, Эсьер Ньюман.

На міжнародных кінафестывалях у Канах, Таронта, Марэліі і Цесалоніках упершыню была паказана мексіканская кінастужка **«Драма»**.



У цэнтры кінаапавядання — тры ўзаемапераплеценыя гісторыі, дзеянне якіх адбываецца на калісьці шыкоўным мексіканскім курорце Акапулька: да халоднай прыгажуні Фернанды вяртаецца былы палюбоўнік — не ў меру шчадралюбны Чана; няшчасны клерк Гансала спрабуе скончыць самагубствам; нядобрая дзяўчынка-падлетак выратоўвае яму жыццё...

Пастаноўку карціны па сваім сцэнарыі ажыццявіў малады рэжысёр Херарда Наранхо. Яна была прызнана лепшым фільмам праграмы «Тыдзень крытыкі» Канскага МКФ. У фільме здымаліся Фернанда Бесерыль, Хуан Пабла Кастанеда, Дыяна Гарсія, Марыяна Маро.

Знакамітым японскім сцэнарыстам, рэжысёрам і акцёрам Такешы Кітано створана камедыйная драма **«Банзай, рэжысёр!»**.

У сваёй апошняй карціне Такешы зноў пацвярджае заслужаны статус майстра на ўсе рукі і праніклівa здзекуецца з усіх жанраў разам і паасобку. З таго, што яшчэ не зняў, ён, зрэшты, з не меншым запалам здзекуецца таксама. Самога сябе ён паказвае ў выглядзе манекена, якога пастаянна носіць пад пахай і ў якога ператвараецца, калі сітуацыя становіцца для яго непрыемнай. «Банзай, рэжысёр» — па сутнасці, віртуозны кінаальманах чалавека-аркестра на тэму ўласнай творчасці.



У ролях: Такешы Кітано, Эн Судзукі, Кейко Мацузакі, Есіно Кімура, Юкі Учыда.

**Раман КОСЦІН.**

**ЗАВЕРЕНО**
Директором Департамента по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь Гальпериным А.Л.
14.10.2008

Паритетбанк

**УТВЕРЖДЕНО**
Наблюдательным Советом ОАО «Паритетбанк»
18.09.2008 г., протокол № 10

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## об открытой продаже облигаций третьего выпуска

ОАО «Паритетбанк»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках):**

На белорусском языке:
полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Парытэтбанк»;
сокращенное – ААТ «Парытэтбанк».
На русском языке:
полное – Открытое акционерное общество «Паритетбанк»;
сокращенное – ОАО «Паритетбанк».

**2. Дата и номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего:**

ОАО «Паритетбанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 02 июля 1992 г., регистрационный № 5.

**3. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail):**

Юридический и почтовый адреса: 220090, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Гамарника, д. 9, корп. 4;
телефон: (017) 288 32 48, 288 32 49. Факс: (8017) 288 38 47;
e-mail: info@paritetbank.by.

**4. Номера расчетного и валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи:**

Денежные средства при проведении открытой продажи третьего выпуска облигаций ОАО «Паритетбанк» (далее – облигации) будут зачисляться на счет 4940800010036 в ОАО «Паритетбанк», код 782, УНП 100233809.

**5. Сумма зарегистрированного уставного фонда:**

Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 93 368 435 202 (Девяносто три миллиарда триста шестьдесят восемь миллионов четыреста тридцать пять тысяч двести два) рубля.

**6. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном пунктом 9 Инструкции о порядке представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг, утвержденной постановлением Комитета по ценным бумагам при Совете Министров Республики Беларусь от 16 декабря 2005 г. № 10/П «О некоторых вопросах представления отчетности и раскрытия информации участниками рынка ценных бумаг», и сроки ее публикации:**

Периодическое печатное издание – газета «Звязда»;
Сроки опубликования – не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

**7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии):**

С более подробной информацией и Проспектом эмиссии облигаций третьего выпуска ОАО «Паритетбанк» можно ознакомиться, начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста данной краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу: 220090, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Гамарника, д. 9, корп. 4 с 9.00 до 15.00.

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение:**

Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО «Паритетбанк» 18.09.2008, протокол № 10.

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций:**

Облигации выпускаются в форме записей на счетах.
Объем эмиссии облигаций составляет 20 000 000 000 (Двадцать миллиардов) белорусских рублей.
Количество облигаций – 20 000 (Двадцать тысяч) штук.
Серия «ПБ–3», номера «000001 – 020000».

**10. Номинальная стоимость:**

Номинальная стоимость облигаций – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

**11. Цель выпуска облигаций:**

Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

**12. Период проведения открытой продажи облигаций:**

Открытая продажа облигаций проводится с 20.10.2008 по 20.04.2009 и прекращается в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

**13. Место и время проведения открытой продажи облигаций:**

Открытая продажа облигаций начинается после государственной регистрации облигаций и опубликования текста краткой информации об открытой продаже облигаций в периодическом печатном издании и осуществляется на внебиржевом рынке и/или на торгах ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Владельцами облигаций могут быть резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь – юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Для приобретения облигаций юридические лица и индивидуальные предприниматели могут обращаться в ОАО «Паритетбанк» в рабочие дни периода проведения открытой продажи облигаций с 9:00 до 15:00.

В день начала открытой продажи (20.10.2008) облигации размещаются по цене, равной номинальной стоимости.

Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает накопленный купонный доход (НКД) за текущий купонный период со дня начала текущего купонного периода по день фактической продажи, рассчитываемый по следующей формуле:

**НКД = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + …. + Kn*H*tn)/(365(366)*100)**

где:
НКД – накопленный купонный доход;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части текущего купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней текущего купонного периода, истекших со дня начала текущего купонного периода;
K1, K2, Kn – процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 2 (Два) процентных пункта;
Н – номинальная стоимость облигации.

Расчет накопленного купонного дохода по облигациям осуществляется по каждой облигации исходя из фактического количества дней в году (365 или 366). Проценты начисляются за каждый календарный день года.

Юридические лица и индивидуальные предприниматели, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить ОАО «Паритетбанк» денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором открытой продажи облигаций.

Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

**14. Срок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций – 742 календарных дня (с 20.10.2008 по 31.10.2010).

**15. Дата погашения облигаций**

Дата погашения облигаций – 01.11.2010.

**16. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты**

Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период, определенный в Проспекте эмиссии, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 2 (Два) процентных пункта.

Купонный доход рассчитывается по следующей формуле:

**Д = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + …. + Kn*H*tn)/(365(366)*100)**

где:
Д – купонный доход;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней в соответствующем купонном периоде;
K1, K2, Kn – процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 2 (Два) процентных пункта;
Н – номинальная стоимость облигации.

Расчет купонного дохода по облигациям осуществляется по каждой облигации исходя из фактического количества дней в году (365 или 366). Проценты начисляются за каждый календарный день года.

Выплата части купонного дохода не производится.

**17. Порядок погашения облигаций**

При погашении владельцам выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также выплачивается доход за последний купонный период.

Погашение облигаций производится на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств на счета владельцев облигаций в белорусских рублях, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При погашении облигации выплата части номинала облигации не производится.

**18. Период начисления процентного дохода по облигациям**

Выплата дохода владельцам облигаций производится периодически (в соответствии с Графиком выплаты купонного дохода) в виде купонного дохода на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы купонного дохода на счета владельцев облигаций в белорусских рублях, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь.

**График выплаты купонного дохода по облигациям**

| Номер купона (процентного периода) | Начало периода | Конец периода | Продолжительность периода, дней | Дата выплаты дохода |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 20/10/2008 | 31/01/2009 | 104 | 01/02/2009 |
| 2 | 01/02/2009 | 30/04/2009 | 89 | 01/05/2009 |
| 3 | 01/05/2009 | 31/07/2009 | 92 | 01/08/2009 |
| 4 | 01/08/2009 | 31/10/2009 | 92 | 01/11/2009 |
| 5 | 01/11/2009 | 31/01/2010 | 92 | 01/02/2010 |
| 6 | 01/02/2010 | 30/04/2010 | 89 | 01/05/2010 |
| 7 | 01/05/2010 | 31/07/2010 | 92 | 01/08/2010 |
| 8 | 01/08/2010 | 31/10/2010 | 92 | 01/11/2010 |

В случае если дата выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день, выплата купонного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму купонного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочим днем в настоящем Проспекте эмиссии считается нерабочий день ОАО «Паритетбанк».

Первый купонный доход по облигации начисляется со дня начала купонного периода, в котором было произведено первичное размещение данной облигации, по день его истечения включительно (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем).

Второй и последующие купонные доходы (включая последний) по облигации начисляются со дня начала очередного купонного периода по день истечения данного купонного периода включительно (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем).

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете ОАО «Паритетбанк» до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

**19. Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций**

Реестр владельцев облигаций формируется за 5 рабочих дней до дня выплаты купонного дохода за соответствующий купонный период и за 5 рабочих дней до дня их погашения.

**20. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам:**

Эмитент производит возврат средств не позднее 10 рабочих дней со дня запрета выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам.

**21. Дата и номер государственной регистрации облигаций:**
14 октября 2008 г. № 5-200-02-0195.

**22. Информация об обеспечении облигаций**

Облигации в соответствии с п. 1.8 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» выпускаются в размере, не превышающем 80 процентов нормативного капитала ОАО «Паритетбанк».

**Председатель Правления** **С.Л. Панковец**
**Главный бухгалтер** **М.М. Абраменко**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5.*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.40 | 18.09 | 10.29 |
| Віцебск — | 7.32 | 17.57 | 10.25 |
| Магілёў — | 7.30 | 18.00 | 10.30 |
| Гомель — | 7.24 | 17.59 | 10.35 |
| Гродна — | 7.54 | 18.25 | 10.31 |
| Брэст — | 7.52 | 18.28 | 10.36 |

**Месяц**

***Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.** Васілісы, Дзяніса, Івана.*
***К.** Маргарыты, Фларанціны, Ядвігі, Герарда.*

## НАДВОР'Е на заўтра




**...у суседзяў**

ВАРШАВА +6..+8°С
ВІЛЬНЮС +8..+10°С
КІЕЎ +13..+15°С
МАСКВА +9..+10°С
РЫГА +11..+13°С
С.-ПЕЦЯРБУРГ +9..+11°С

## 16 кастрычніка

Дзве даты



**1947 год** — за публічную нязгоду з вучэннем «народнага» акадэміка Тараса Лысенкі і «прапаганду буржуазнай навукі» зняты са сваёй пасады прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.Р. Жэбрак.

**1978 год** — кракаўскі кардынал Караль Вайтыла выбраны папам Рымскім. Папа Ян Павел II стаў першым славянінам на гэтай пасадзе. За час свайго пантыфікату папа наведаў больш як 100 краін свету, пераадолеўшы на сваім самалёце адлегласць, якая ў тры разы перавышае адлегласць ад Зямлі да Месяца.

Цытата дня:

***«Вось у чым розніца паміж шчасцем і мудрасцю: той, хто лічыць сябе самым шчаслівым, сапраўды самы шчаслівы; але той, хто лічыць сябе самым мудрым, хутчэй за ўсё, — самы вялікі дурань».***

**Чарлз Колтан (1780—1832), англійскі пісьменнік.**

# ЗНАХАР

Свет і сусвет чалавека

**Знахар** (знахарка, лекарка) — чалавек з пэўнай здольнасцю лячыць людзей, жывёлу, здольны ахоўваць ад варажбы і сурокаў, прадказваць будучыню, валодае звышнатуральнымі, магічнымі ведамі, выконвае магічныя рытуальныя дзеянні. Таго, хто выкарыстоўваў у сваёй лекарскай практыцы толькі травы, у народзе звалі траўнікамі.

● Знахар (руск. «знать») стаяў у адным шэрагу з чарадзеямі, ведзьмакамі (ад слова «веды»), але лічылася, што знахар не кантактаваў з нячыстай сілай. У сваёй рабоце ён выкарыстоўваў сілу замовы і малітвы, лекавыя травы, карані, сілу і энергетыку вады і іншыя магічныя рэчы, надзеленыя ў культуры сакральнасцю.

● Знахар заўсёды насіў крыж на целе і хрысціўся перад тым, як пачаць сваю работу.

● Знахар павінен быў дапамагчы чалавеку адолець шматлікія захворванні фізічнага кшталту, дапамагаць жанчынам пры родах, але асноўнай яго задачай было супрацьстаянне такім энергетычным праявам дрэнных сілаў, як сурокі. Знахары паспяхова лячылі псіхічныя захворванні: спалохі, эпілепсію («падучую» ці «чорную» хваробу).

● Да знахараў заўсёды былі дваістыя адносіны. З аднаго боку, да іх заўсёды прыходзілі з надзеяй на выратаванне, звярталіся па дапамогу ў час засухі ці, наадварот, працяглых дажджоў, у іх прасілі дапамогі ў каханні і сямейным шчасці. З другога боку, у народзе лічылі, што таксама, як і ведзьмакі, знахары не абыходзяцца без падтрымкі нячыстай сілы. Гэтаму існаваў і свой доказ: знахар заўсёды цяжка і ў пакутах паміраў, калі не мог перадаць «веды», якімі валодаў.

● Лічылася, што веды такога кшталту перадаюцца нашчадкам: ад дзеда бацьку, ад бацькі сыну, унуку і г.д. У той жа час у народзе лічылася, што знахарствам пры жаданні можна авалодаць, як і любой іншай справай.

● Лепшымі знахаркамі лічылі «чыстых» жанчын: сталых жанчын, удоў, а таксама тых, хто нарадзіўся ў панядзелак ці пасля смерці бацькі.

● Знахары, пасля выканання пэўных магічных дзеянняў, маглі дакладна паказаць на рабаўніка ці злодзея.

● Пры дапамозе знахараў змагаліся з заломамі на жытнёвым полі, ахоўвалі хатнюю жывёлу ад эпідэміі і мору.

● Каб выканаць тыя ці іншыя рытуальныя дзеянні, знахары выбіралі спрыяльны час: напрыклад, суботу — «як субота заканчвае тыдзень, так і хвароба закончыцца»; стан месяца на небе: усход ці захад сонца. У той жа час строга прытрымліваліся правіла не займацца «такой» справай у пост і вялікія царкоўныя і народныя святы.

● Акрамя гэтага, выбіралі месца правядзення абраду. Часцей за ўсё гэта было месца каля вады, ручая, калодзежа, на скрыжаванні шляхоў, там, дзе не будуць хадзіць людзі і хатняя жывёла.

**ЗАМОВА АД СУРОКАЎ І ХВАРОБАЎ**

*«Першым разам, Божым часам. Госпаду Богу памалюсь, Прачыстай Матцы пакланюсь і ўсім святым нябесным апосталам, кіяўскім і пячэрскім, сонцу краснаму, месячку яснаму. Было ў месячкі тры братцы: адзін зоры спатухая, другі свет адсвятая, трэці сурокі сунімая з раба Божага (імя), з буйныя галавы, з рацівага сэрца, з русых кос, з жоўтых касьцей, з ясных вачэй, з белага ліца. Дух на цябе, усё ліха з цябе!».*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Усміхнёмся!

Калі раніцай жонка вас будзіць са словамі: «Прачніся, мілы, я прыгатавала табе твой любімы снядадак», гэта значыць, што:

1) вы заснулі ў палюбоўніцы;
2) вы яшчэ не прачнуліся;
3) напярэдадні ўвечары яна купіла сабе сумку ад Луі Вітон;
4) абед вам будзе падаваць цешча, якая прыехала пагасцяваць на месяц;
5) ноч атрымалася;
6) напярэдадні ўвечары вы прыйшлі дадому зусім п'яным і, калі яна дапамагала вам распранацца, сказалі ёй: «Адчапіся, нягодніца, я жанаты!»;
7) на вуліцы дождж, і трэба выгульваць сабаку;
8 ) калі ваша жыццё застрахаванае, пераканайцеся, што кава не пахне антыфрызам...

☺

**— Учора на футболе быў, такое задавальненне атрымаў...**
**— А хто выйграў?**
**— Не ведаю. Я з дзяўчынай быў.**

☺

Пагроза начальніка:
— Ды я цяпер з цябе вакансію зраблю!!!

☺

**Жонка:**
**— Нешта ў мяне левая рука свярбіць... Гэта, мусіць, да грошай.**
**Муж (не адрываючыся ад газеты):**
**— Не дам!**

**— Учора, выпадкова, капнула на любімую сарочку мужа хлорным адбельвальнікам...**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.350 Індэкс 63850. Зак. № 5705. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12